№10(193)

ПАХОДНЯ

Грамадска-палітычная газета

Травень 2015 г.

КАЛОНКА НАВІН

У краіне

Международный валютный фонд прогнозирует снижение золотовалютных резервов Беларуси к концу года почти в 2 раза.

Золотовалютные резервы Беларуси сократятся почти в 2 раза с нынешних 4,5 млрд. до 2,5 млрд. (0,8 объема месячного импорта) на конец текущего года.

Прогноз по снижению ЗВР можно объяснить величиной затрат на обслуживание внешнего госдолга и отсутствием, по крайней мере, на данный момент внятных источников финансирования этих затрат.

Кроме того МВФ подтвердили свой прогноз относительно перспектив развития экономики Беларуси в 2015 году. В частности, спад ВВП составит порядка 2,2-2,3%, дефицит текущего счета сохранится на уровне 7% ВВП, инфляция составит 22%.

У Прыдняпроўі

У Магілёве пяць жыхароў дома 59 па вуліцы Ленінскай пачалі бестэрміновую галадоўку. Да крайняй меры іх падвяла бяздзейнасць і абыякавасць чыноўнікаў да іх праблемы. Перапіска з дзяржструктурамі цягнулася больш за год, аднак так і не дала ніякага выніку.

Пра пачатак галадоўкі магілёўцы пісьмова паведамілі ў Магілёўскі гарвыканкам, аблвыканкам, пракуратуру Магілёўскай вобласці, Генеральную пракуратуру і Адміністрацыю прэзідэнта.

У раёне

Реальные располагаемые денежные доходы населения (денежные доходы за вычетом налогов, сборов и взносов, скорректированные на индекс потребительских цен на товары и услуги) в I квартале 2015 года в Могилёвской области (в том числе и в нашем Белыничском районе) по сравнению с I кварталом 2014 года снизились на 6,2 %.

А ПА ТЭЛЕВІЗАРЫ ЎСЁ ДОБРА

Паводле дадзеных Белстата, амаль усе асноўныя сацыяльна-эканамічныя паказчыкі Беларусі ў студзені-красавіку 2015 года дэманструюць падзенне.



І гэта яшчэ вельмі мякка сказана, бо фактычна эканоміка Беларусі ўвайшла ў крутое піке. Так, ВУП нашай краіны ў параўнанні з аналагічным перыядам 2014 года ўпаў на 2,6%, прадукцыйнасць працы — на 1,1%. Вытворчасць прамысловай прадукцыі знізілася на 7,5%, інвестыцыі ў асноўны капітал — на 5,9%, грузаабарот — на 5,2%, тавараабарот грамадскага харчавання — на 10,4%.

Спажывецкія цэны выраслі на 16,4%. Пры гэтым на прамысловую прадукцыю цэны выраслі на 17,5%, на сельскагаспадарчую прадукцыю — на 11,7%, а ў сферы будаўніцтва — на 14,7%.

Сумарная завінавачанасць прадпрыемстваў за год вырасла на 31,9%. Аб'ём знешняга гандлю таварамі і паслугамі ў 1-м квартале ўпаў на 30,7%.

Намінальная заработная плата беларусаў вырасла на 13,1%, аднак рэальная знізілася на 4,2%.

Колькасць працаўнікоў, пераведзеных на няпоўны працоўны дзень, у сакавіку 2015 года ў параўнанні з сакавіком 2014 г. павялічылася ў 5,5 разу.

Колькасць працаўнікоў, адпраўленых у адпачынак без захавання заработнай платы альбо з частковай яе выплатай, узрасло ў 2,8 разу.

Аднак па беларускім тэлебачанні пра сумныя вынікі працы нашага нязменнага кіраўніка і яго верных чыноўнікаў чамусьці асабліва казаць не хочуць. Затое там цэлымі гадзінамі распавядаюць казкі пра тое, колькі "дармавых" грошай дасць нам у крэдыт братэрскі Кітай і як мы пасля гэтага слаўна зажывём.

Паверце мне на слова –"трындзяць", канешне. Браты-кітайцы даюць свае грошы толькі для таго, каб мы закупілі на іх "якасныя" кітайскія тавары і абсталяванне (жывы прыклад такога "плённага" супрацоўніцтва – крухмальны завод у Цяхціне ў нашым раёне, ці цэментны завод у Крычаве), ну а нам і нашым дзецям з унукамі застануцца даўгі, якія ўсё роўна ў любым выпадку патрэбна будзе плаціць.

Але Рыгоравіча і яго каманду гэта не вельмі хвалюе. Ім бы пратрымацца да чарговых "выбараў", ну а там пасля калі нешта і ляснецца, то цярплівы беларускі народ скажа "можа, так і трэба".

Ну а пакуль, паважаныя чытачы, уважліва слухайце выказванні

(Заканчэнне на стар. 6)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

ПОСЛЕДНИЙ БОЙ КАПИТАНА ХИГРИНА

Если ехать из Могилева в Минск по трассе М-4 (шоссе Минск-Могилев),то за райцентром Белыничи, по правую сторону дороги ,перед речкой Осливка можно увидеть рядом с шоссе поставленную на постамент пушку. Говорят, что таким образом отмечено место боя, за который в 1941 году капитан Б. Хигрин получил звание Героя Советского Союза. Однако, на самом деле бой происходил в другом месте, чуть восточнее речки Клёва.



Командиром дивизиона капитан Борис Хигрин стал на второй день войны, когда пришла пора полку грузиться в эшелон и ехать на запад. Выяснилось, что тяжело болен командир 2-го дивизиона и заменить его должен начальник полковой школы Хигрин.

462-й корпусной артполк, где служил Хигрин, входил в состав 47-го стрелкового корпуса и до войны располагался в Бобруйске.22 июня 1941 года управление корпуса с приданными частями получило приказ выдвинуться в район Барановичи. Первым эшелоном отправили два дивизиона корпусного артполка. В их число попал и 2-й дивизион капитана Бориса Хигрина. Следом отправилось и командование корпуса ,но железнодорожный узел в Минске уже был разрушен ,так что пришлось свернуть в сторону Слуцка и уже там через несколько дней встречать противника. А дивизион капитана Хигрина доехал до Барановичи и там принял первый бой уже в составе другого соединения.

Потом артиллеристы с боями отступали через Шацк, Пуховичи, Червено. Днем воевали, а ночью меняли позиции. Так вышли на Могилевское шоссе, где соединились с частями 4-го воздушно-десантного корпуса. Вместе обороняли мосты через Березину.По приказу командования Могилевское шоссе пришлось защищать 7-й и 8-й воздушно-десантным бригадам. Десантникам по штату не полагалась крупнокалиберная артиллерия, а как без неё справиться с 10-й танковой дивизией вермахта? И тут десантникам на выручку пришли дивизионы корпусного артполка.

К 5 июля 1941 года десантники и артиллеристы отошли на рубеж реки Друть у поселка Белыничи. Чтобы выиграть время для устройства оборонительных позиций, впереди оставили огневой взвод лейтенанта Козырева из 2-го дивизиона капитана Хигрина. Он должен был задержать танки противника.

Взвод – это две гаубицы-пушки МЛ-20 калибра 155 миллиметров. Мощное оружие в умелых руках. МЛ-20 использовалась для стрельбы с закрытых позиций по живой силе противника, его фортификациям и заграждениям, важным объектам в его ближнем тылу. Огонь батареи МЛ-20 осколочно-фугасными снарядами представлял большую угрозу не только для живой силы и укреплений противника, но и для его бронетехники. Осколки пробивали броню танков и бронетранспортеров.. Иной раз сотрясения от близкого разрыва 40-килограмового снаряда было достаточно для поломки узлов и агрегатов внутри танка или самоходки. Бронебойный снаряд гаубицы-пушки пробивал на дальности в один километр броню толщиной в 10 сантиметров. А вообще дальность стрельбы составляла 16 километров.Одним словом, самое современное по тем временам оружие. Правда, большой вес- семь тонн и габариты -длина орудия около восьми метров, затрудняли маневренность. Буксировалась гаубица мощным гусеничным тягачом со скоростью в 20 километров в час.

Орудия установили прямо на шоссе чуть восточнее моста через реку Клёва, недалеко от деревни Корытница. С небольшой возвышенности было видно, что перед мостом и за мостом дорога проходила в выемке, что лишало маневра идущие на Могилев танки. Достаточно было подбить в этом месте одну машину, чтобы на несколько часов парализовать всякое движение по шоссе.Большая часть 2-го дивизиона находилась у Белыничи, но, тем не менее, капитан Хигрин решил не оставлять молодого командира взвода один на один с опытным противником и остался на наблюдательном пункте, чуть позади огневой позиции.

Было ранее июльское утро. Только рассеялся утренний туман над рекой, как послышался шум моторов со стороны Погоста.Между тем, полк закончил подготовку новых позиций и его командир, майор Собкалов принял решение отвести огневой взвод Козырева к Белыничи. Помощник начальника штаба 2-го дивизиона лейтенант Иван Цупиков сел в полуторку и помчался к речке Клева.

Ещё издали он увидел, как к мосту движется передовой отряд танковой дивизии, а наши орудийные расчеты уже заняли свои места. Отходить было уже поздно. Через несколько минут взвод открыл по шоссе огонь прямой наводкой. Мощные снаряды рвались посреди колонны немецкой техники. Несколько танков задымилось, остальные остановились и начали вести ответный обстрел.

Бой принял затяжной характер. Один за одним выбывали из строя артиллеристы. Замолкло одно из орудий. Противник оживился и несколько немецких танков стали медленно продвигаться вперед. Увидев это, капитан Хигрин покинул наблюдательный пункт и побежал к орудию. Его примеру последовал и лейтенант Цупиков. И вот уже они с уцелевшими номерами орудийного расчета вновь ведут огонь по противнику. За наводчика капитан Хигрин. Меткими выстрелами подбит один танк, потом второй, третий, четвертый.

(Окончание на стр. 3)

ПОСЛЕДНИЙ БОЙ КАПИТАНА ХИГРИНА

(Оконч. Начало на стр. 2)

Вражеская атака заглохла. Пока шел бой, немцы успели подтянуть свою артиллерию и она открыла плотный огонь по нашей позиции .Осколки от взрывов летели во все стороны ,один из них смертельно ранил капитана Хигрина.

Младший сержант Шомбин под огнем вынес тело своего командира в укрытие. Выжил в этом бою и лейтенант Цупиков. Он прошел всю войну, сам стал командиром батареи.

В 1981 году, в год 40-летия обороны Могилева, Н. Андрущенко, научный сотрудник Института истории БССР, разыскал однополчан Хигрина. Они, а также жители Корытницы и помогли установить точное место боя героического взвода.

Между тем, до сих пор Википедия сообщает, что бой состоялся на левом берегу р. Друть у пос. Белыничи. Газета «Рэспублика» 8 мая 2010 года пошла ещё дальше: «Бессмертный подвиг совершил 5 июля 1941 года уроженец Орши, командир артиллерийского дивизиона 462-го артиллерийского полка капитан Борис Хигрин. Его дивизион занял позиции на шоссе Бобруйск—Могилев, у реки Друть”.

Заменивший Б.Хигрина в должности командира дивизиона капитан Кригер-Лебедев 12 июля 1941 года при оформлении наградного листа на младшего сержанта Шомбина, участника того боя, указал, что бой состоялся на реке Ослик (так на довоенных топокартах обозначена нынешняя речка Осливка).

Составляя наградной лист на самого капитана Хигрина, военком 462-го кап в свою очередь утверждал, что в ходе боя в районе реки Друть капитан лично уничтожил 4 танка противника.

Не обошли своим вниманием подвиг на реке Клева и десантники. И вот в истории 4-го воздушно-десантного корпуса появились такие строки: «Высокое мужество проявили десантники-артиллеристы. Когда при отражении очередной танковой атаки вышел из строя расчет одного из орудий, командир артдивизиона капитан Б. Л. Хигрин встал за орудие и прямой наводкой уничтожил 3 танка противника. Продолжая мужественно отражать атаки вражеских танков отважный командир пал смертью героя. За совершенный подвиг он был удостоен звания Героя Советского Союза. Капитан Б. Л. Хигрин стал одним из первых Героев Советского Союза среди воинов-десантников, удостоенных этого звания в годы Великой Отечественной войны».

Естественно, что дивизион капитана Хигрина никакого отношения к десантным войскам не имел. Лишь случай свел на короткое время десантников и артиллеристов.

А мы, в заключение, хотели бы заметить, что лишь два воина РККА принявших участие в наземных боях в ходе Белорусской оборонительной операции летом 1941 года были отмечены высоким званием Героя Советского Союза. Это старший сержант Яков Беляев из разведбата 100-й стрелковой дивизии и герой нашего рассказа капитан Борис Хигрин.

Леонид Плоткин,
“Masheka.by”

ГЕННАДИЙ ФЕДЫНИЧ: ПОЧЕМУ ВЛАСТЬ ПРИЗЫВАЕТ ЗАТЯНУТЬ ПОЯСА, А САМА КАК ЖИРОВАЛА, ТАК И ЖИРУЕТ?

Белорусская модель экономики «приплыла», но режим не признает своих ошибок.

Белорусское руководство «не заметило» требования в течение месяца погасить долги по зарплате, которые профсоюз РЭП направил в государственные структуры. Съезд профсоюза РЭП потребовал от белорусского руководства «обеспечить реальные заработки, пенсии, стипендии и денежные пособия не ниже докризисного уровня декабря 2014 года в долларовом выражении; погасить задолженности по заработной плате на всех предприятиях и в организациях, независимо от форм собственности, не позднее 29 мая 2015 года».



О реакции властей на ультиматум профсоюза и дальнейших планах «Беларускай праўдзе» рассказал лидер Беларуского профсоюза работников радиоэлектронной промышленности Геннадий Федынич.

- Реакции властей нет. Пришел только ответ из «палаты представителей», что мы не так оформили свои требования. Мы переоформили. Но дело ведь не в оформлении. Можно проигнорировать наши требования вообще, можно забыть про закон об обращениях граждан, но проблему нужно решать. Неважно, кто ее поднимает: РЭП, предприятия, гражданин. Власть должна решать проблемы, которые ставит жизнь.

Я сегодня не верю власти не потому, что не хочу верить. Когда сокращаются штаты в районах, в ПМК или на заводах, почему нет сокращений в президентской администрации? Почему власть призывает затянуть пояса, а сама как жировала, так и жирует? Люди не чувствуют, что эта власть народная, они видят власть Лукашенко. Станет власть народной, тогда и отдача пойдет от народа.

(Продолжение на стр. 7)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

АБ СУСТРЭЧЫ Ў АЛЕКСАНДРЫІ І "ГАРАДЗЕЦКІХ УРОКАХ"

"Давайце ня будзем тут спяшацца. Надыдзе час, і гэтае пытанне будзе вырашана", — выказаўся Аляксандр Лукашэнка аб прыватнай уласнасці на зямлю. "Галоўнае, каб зараз людзі не баяліся прыйсці на арандаваную зямлю, былі ўпэўненыя, што ў іх яе ніхто не забярэ. Калі ў нас заканадаўства ў гэтым плане не хапае, мы яго дапоўнім. Галоўнае — непахіснасць права прыватнай уласнасці», — дадаў ён у час сустрэчы з фермерамі 2 мая 2015 года ў аграгарадку Александрыя, што на Шклоўшчыне.

Адным з асноўных, праблемных пытанняў, якія стрымліваюць развіццё фермерскіх гаспадарак, што неаднаразовала гучала з вуснаў фермераў, прысутных на сустрэчы — гэта пытанне аб выкупе арэндаванай імі маёмасці. А дакладней — аб цяжкасцях з яго выкупам.

Па іх сведчаннях, пры пераходзе будынкаў і збудаванняў ва ўласнасць, стаўленне да іх было б зусім іншым, і фермеры гатовы інвеставаць у іх рамонт і мадэрнізацыю значныя сродкі.

"Гэта не той выпадак, дзе дзяржава павінна трымацца за гэтую ўласнасць, напрыклад, стары свінакомплекс, які быў бы даўно ўжо разбураны. Я думаю, нам трэба прадумаць, сабраць разам усе праблемныя пытанні фермерскай супольнасці, звязаныя з уласнасцю, і адным махам іх вырашыць", — тут жа даў даручэнне Лукашэнка.

Слухаючы падобныя завярэнні, адразу прыходзіць на памяць, што дзесьці калісьці ўсё гэта мы ўжо неаднаразова чулі, гэтыя яго доўгаіграючыя выказванні аб неабходнасці вырашэння праблемных пытанняў у сельскай гаспадарцы. Бо безліч сельскагаспадарчых аб'ектаў, збудаванняў, фермаў прыйшло ў заняпад за апошнія два дзесяцігоддзі, але так і не былі перададзены ў прыватную ўласнасць або арэнду вяскоўцам.

Яшчэ 28 год таму, ужо ў далёкім 1987 годзе, працуючы дырэктарам саўгаса "Гарадзец" Шклоўскага раёна, Лукашэнка актыўна прапагандаваў новыя формы працы ў сельскай гаспадарцы — арэндны падрад, які, па яго словах, павінен быў выбіць глебу з-пад ног чыноўнікаў. Дадзены досвед прапагандаваўся як у Беларусі, так і для іншых рэгіёнаў Савецкага Саюзу.

А ў 1990 годзе нават пабачыла свет ягоная кніга "Гарадзецкія ўрокі", дзе ён дзяліўся досведам рэфармавання саўгаса і сцвярджаў, што пры пераходзе на новыя формы чалавек становіцца сапраўдным гаспадаром на зямлі. Не на словах, а на справе. Што невялікія адпаведныя калектывы і фермерскія гаспадаркі адраджаюць вёску, вяртаюць яе да паўнацэннага жыцця.

Перспектывы новых форм гаспадарання Лукашэнка прапагандаваў і сваім асабістым прыкладам. Паралельна з дырэктарствам у саўгасе, ён быў яшчэ зарэгістраваны і фермерам.

"Селянін, рабочы павінны цвёрда ведаць, што арэнда — гэта не даніна якойсці модзе, гэта не павевы часу, а надоўга. Калі ў самыя кароткія тэрміны карэнным чынам не зменіцца псіхалогія людзей, якія адвыклі дзейнічаць па-гаспадарску, нічога талковага не будзе", — пісаў Лукашэнка ў сваёй кнізе.

З тае пары прайшло шмат часу. Многае змянілася: распаўся Савецкі Саюз, Беларусь стала незалежнай дзяржавай, а Лукашэнка стаў першым прэзідэнтам. І ў яго з'явіліся магчымасці правядзення рэформаў не ў асобна ўзятым саўгасе "Гарадзец", а ва ўсёй сельскай гаспадарцы краіны, каб, нарэшце, на беларускай зямлі з'явіліся сапраўдныя сяляне-гаспадары.

Але ж што атрымалася ў выніку? Што сталася з "Гарадцом"? Што сталася з беларускай вёскай?

У саўгасе "Гарадзец" за гэты час змянілася больш дзесятка дырэктароў.Пра арэндны падрад там ужо ніхто нічога і не памятае.

А на зямлі ў беларускай вёсцы як не было гаспадара, так і няма. Колькасць фермераў у краіне за гэты час скарацілася ў разы. Адміністратыўна-камандная сістэма не тое, што не зжывае сябе ў рэгіёнах, а наадварот, яшчэ больш ахапіла ўсе сферы мясцовага жыцця.

Усё гэта прывяло да таго, што адбываецца інтэнсіўнае старэнне і збядненне сельскага насельніцтва. Зачынены сотні вясковых школ, устаноў культуры і аховы здароўя. Моладзь не бачыць перспектывы ў вясковым жыцці. І самае страшнае — з



году ў год узмацняецца грабежніцкая палітыка дзяржавы ў адносінах да вясковага насельніцтва.

З мапы Беларусі зніклі і працягваюць знікаць тысячы так званых "неперспектыўных" вёсак, зарастаюць хмызняком былыя дабротныя палі і лугі, дзе калісці каласілася жыта і пасвіліся статкі жывёлы. Ды нягледзячы на скарачэнне вясковага насельніцтва, колькасць чынавенства ў сельскіх рэгіёнах і чыноўнікаў, звязаных з сельскагаспадарчай вытворчасцю, пастаянна ўзрастае.

Дык чаму ж Аляксандр Рыгоравіч, стаўшы прэзідэнтам, так баіцца прыватнай уласнасці на зямлю і , нават, "махнуў рукой" на свае "Гарадзецкія ўрокі"?

Ён разумее, што стварэнне класа сапраўдных гаспадароў на зямлі — гэта рэальная пагроза існуючаму на Беларусі рэжыму. Кіраваць жа людзьмі, патрэбы якіх звужаюцца да "чаркі і шкваркі", значна лягчэй і прасцей.

За ўсе гэтыя гады, нават нягледзячы на значныя фінансавыя ўліванні (толькі за апошняе дзесяцігоддзе — 45 млрд. даляраў), сельская гаспадарка Беларусі так і не дасягнула адпаведных поспехаў. Фінансы проста не даходзяць да вёскі.

(Заканчэнне на стар. 5)

АБ СУСТРЭЧЫ Ў АЛЕКСАНДРЫІ І “ГАРАДЗЕЦКІХ УРОКАХ”

(Заканч. Пачатак на стар. 4)

Зноўку чынавенства вырашае за селяніна — дзе і якую жывелу набываць, якую тэхніку і насенны матэрыял пастаўляць у калгасы і якія аб’екты будаваць на сяле. У выніку атрымліваецца, што сабекошт аднаго скатамесца на пабудаваных у Беларусі комплексах дасягае да 10 тыс. даляраў, пры еўрапейскіх стандартах — да 3 тыс. еўра, а дзесяткі, сотні мільёнаў даляраў на набыццё жывёлы за мяжой асядаюць у карманах чынавенства.

Пабудаваныя на сяле так званыя “прэзідэнцкія” домікі пераходзяць у разрад аварыйных і непрыгодных для пражывання адразу ж пасля іх уводу ў эксплуатацыю, а новая сельскагаспадарчая тэхніка не даходзіць да механізатараў і выходзіць са строю па дарозе з заводаў у гаспадаркі.

І зусім смешнымі выглядаюць словы кіраўніка краіны, выказаныя на сустрэчы з фермерамі ў Александрыі, што еўрапейцы зайдросцяць беларускім аграрыям, бо ў Еўропе далёка не ўсе фермеры могуць дазволіць сабе працаваць на вялікіх плошчах зямлі, бо зямля прыватная і канкурэнцыя вельмі жорсткая…

Няўжо не зразумела, што менавіта адносіны да зямлі ў Еўропе, канкурэнцыя і спрыяюць таму, што кошты на прадукты харчавання там у разы таннейшыя, чым у Беларусі.

Можа быць, Аляксандру Рыгоравічу варта яшчэ раз перачытаць сваю кнігу “Гарадзецкія ўрокі”, бо, відаць, у 1990 годзе ён яе не зусім уважліва чытаў.

Рыгор Кастусёў

Очередная конфискация

6 мая на рынке в г.п. Белыничи БЭП, ОДО, ИМНС в ходе проверки деятельности индивидуальных предпринимателей, жительниц г.п. Белыничи, 1957 и 1971 г.р., выявлены нарушения реализации одежды и обуви производства РФ без наличия документов, подтверждающих легальность приобретения. Товар на сумму 15 млн. руб. изъят. Проводится проверка, сообщает uvd.mogilev.by.

КРУГЛЯНСКІЯ ДЗЬМУХАЎЦЫ

Пра свае ўражанні ад наведвання Круглянскага раёна распавядае кандыдат эканамічных навук Пётр Мігурскі.



Круглае шпаркімі тэмпамі рыхтуецца да абласных “Дажынак – 2015”. Для належнай арганізацыі гэтага знакавага мерапрыемства з усіх крыніц фінансавання плануецца выдаткаваць 53 млрд. рублёў. Грошы немалыя, але ж і фронт работ, развернуты па добраўпарадкаванню гарадскога пасёлка, не маленькі. Мясцовым будаўнікам і камунальшчыкам прыйдзецца ў сціслы тэрмін правесці капрамонт сямі і бягучы рамонт фасадаў 12 шматкватэрных жылых дамоў, прывесці ў належны стан 34 дваравыя тэрыторыі. Ужо зараз дарожнікі вядуць кладку асфальта па галоўнай вуліцы Круглага. На жаль, грошай хопіць толькі на стварэнне малюнку добраўпарадкавання у цэнтры пасёлка – ні ўскраінныя тэрыторыі, ні, тым больш, вёскі ад мерапрыемства ўшанавання перадавікоў бітвы за ўраджай нічога не займеюць.

Ды што там вёскі – праблем у самім Круглым вельмі шмат, але яны з-за бяздзейнасці мясцовых улад прымаюць для мясцовых жыхароў глабальныя памеры. Напрыклад, колькі разоў уладальнікі жывёлы звярталіся ў райсавет за дапамогай у рамонце “казінага мастка”, якм перакінуты праз мясцовую рэчку і без якога немагчыма арганізаваць паўнавартасны выпас жывёлы. Ламае масток крыгаход, мясцовыя п’яніцы, якія там часам наладжваюць гульбішчы, неадэкватная моладзь, нарэшце, рыбакі. Мясцовыя жыхары выходзілі з прапановай да ўлад зрабіць на суседніх астраўках месца для адпачынку, але і гэта не прайшло. Адзіны разумны савет ад улад – шукайце матэрыялы і рабіце самі. Але што тут зробіш сіламі пенсіянераў, калі гэты масток патрабуе не толькі грошай, але і інжэнернай думкі з тэхнічным суправаджэннем.

Хтосьці можа сказаць, што гэта дробязь… Можа і так, але мясцовую ўладу характарызуе адпаведна. Ці возьмем іншы прыклад. У працэсе падрыхтоўкі да “Дажынак” мясцовыя чыноўнікі вырашылі, што шэраг гадамі апрацоўваемых пенсіянерамі гародаў можа непрыемна ўразіць высокіх гасцёй, якія тут прабудуць цэлых паўдня. Падумалі, прынялі рашэнне і праз колькі часу пайшлі пад нож цяпліцы, кусты бэзу, жасміну, руж… А колькі людзі папрацавалі над гародамі, колькі ўклалі працы і сродкаў. А што зараз? Ды нічога пакуль, толькі гнеў людскі…

Тыя ж пенсіянеркі звяртаюць увагу на іх дом, які за 20 гадоў эксплуатацыі прыйшоў у вельмі кепскі стан, але на яго рамонт (хаця б які) няма грошай.

Няма грошай нават на рамонт каляпад’езднай тэрыторыі, дзе пажылыя людзі раз-пораз спатыкаюцца на выбоінах у бетоне і, нават, падаюць. Ды і адкуль тут будуць грошы, калі прыбытковая частка раённага бюджэту на 66% сфармавана за лік трансфертаў з вышэйстаячых бюджэтаў. Нават і гэта не дапамагло – 2014 год раён завяршыў з дэфіцытам у 7,3 млрд. рублёў. Пры гэтым паступленні ад штрафаў склалі амаль 900 млн. рублёў. На 2015 год распрацаваны бездэфіцытны бюджэт, але цудоўным чынам доля падаткавых даходаў скарацілась з 28,7% да 24,6%. Праўда, каб кампенсаваць сваю чыноўнічую нягеглласць, сесія раённага Савета дэпутатаў зацвердзіла аб’ём штрафаў з мясцовага насельніцтва і суб’ектаў гаспадарання ў памеры 1 млрд. рублёў. Во, маштабы руплівасці чынавенства!

У той жа час сельская гаспадарка па выніках 2014 года спрацавала не на поўную моц – валавай прадукцыі дабавілі толькі 3,1%, вытворчасць мяса буйнарагатай жывёлы, навогул, зменшылі на 1%. Ды і ўраджайнасць зерневых не на вельмі вялікай вышыні – толькі 45,4 ц/га.

(Заканчэнне на стар. 6)

ПАХОДНЯ
ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

КРУГЛЯНСКІЯ ДЗЬМУХАЎЦЫ

(Заканч. Пачатак на стар. 5)

Яшчэ здзівілі вынікі працы прамыслоўцаў – толькі 84% ад узроўню 2014 года. Вось бы дзе накінуцца ўсёй уладай на праблемы і падняць раён! Праўда, трошкі дапамаглі раёну прадпрымальнікі – яны за год павялічылі долю ў прыбытковай частцы аж на 4,3%, хаця колькасць камерцыйных арганізацый у раёне за год не змянілася.

Ёсць вельмі яскравы паказчык актыўнасці ўлады ў эканоміцы, які на адным з першых месцаў у Беларусі – гэта аб'ем прыцягнутых прамых замежных інвестыцый. Дык вось, у Круглянскі раён замежных інвестыцый "прыцягнулі" аж 3,4 тыс. долараў ЗША. Можа б у гэтым напрамку мясцовым уладам лепш трохі папрацаваць, а не змагацца з пенсіянеркамі?

Дарэчы, ёсць яшчэ адзін аб'ект пільнай увагі з боку мясцовай улады –у Круглым хутка можа паўстаць аўтастаянка для пакупнікоў мясцовага "Еўраопта". Праўда, жыхары аб гэтым пакуль не ведаюць.

Дарога да Круглага з боку Магілёва выглядае вельмі прыстойна – трэба аддаць належнае ўсім адказным службам. Але ўражвае мноства дзьмухаўцоў як па абочынах, так і на мясцовых палетках.

Абапал дарогі раскінулася поле з шматгадовымі травамі аднаго з перадавых "калгасаў" Кругляншчыны – тут добрага ўраджаю наўрад ці дачакаюцца – усё поле ў дзьмухаўцах. Многа гэтага расліннага шкодніка і ў горадзе – з такімі тэмпамі распаўсюду вельмі хутка раён можа пераўтварыцца ў запаведны край дзьмухаўцоў, якія запалоняць і без таго не такія ўжо і ўрадлівыя палеткі раёна.

Наогул, уражанні ад наведвання Круглянскага раёна не зусім прыемныя, асабліва пасля гутаркі з пажылымі людзьмі, на патрэбы якіх мясцовыя ўлады не звяртаюць амаль ніякай увагі. А многія ж з іх прайшлі праз ліхалецце вайны, працавалі ўсё жыццё, ды толькі наўрад ці гэта заслугі будуць ацэнены мясцовым чынавенствам.

Але ж ёсць у Круглым месца, дзе кожны мясцовы жыхар і госці раёна адпачываюць душой. Вельмі прыемна, што ўсе суразмоўцы станоўча адзначалі працу мясцовай бібліятэкі. Дабразычлівыя і пісьменныя супрацоўнікі, крэатыўныя падыходы да працы з наведвальнікамі, утульнасць і спакой – ці не тое гэта месца, дзе трэба не толькі набываць веды, але і вучыцца працаваць? Усім.

Пётр Мігурскі

А ПА ТЭЛЕВІЗАРЫ ЎСЁ ДОБРА

(Заканч. Пачатак на стар. 1)

Аляксандра Рыгоравіча, накшталт гэтага: ""Мы будем сохранять трудовые коллективы, но поддерживать будем только тех, кто хочет работать. Впереди еще более мощная конкуренция.

Поэтому разгильдяям, тунеядцам, алкоголикам и проходимцам в трудовых коллективах делать нечего", - якое наш нязменны кіраўнік выказаў 15 траўня на сустрэчы з працаўнікамі Мінскага трактарнага завода.

Ну і рыхтуйцеся да звальненняў, бо, чамусьці, чыноўнікі ў нас заўсёды вельмі добрыя, ну а "рабацягі" – спрэч "разгільдзяі, дармаеды і алкаголікі"…

Іван Барысаў

Воруют…

8 мая Следственным комитетом возбуждено уголовное дело по ст. 205 ч. 1 УК (Кража) в отношении жителя г.п. Белыничи, 1978 г.р., который 19 апреля с прилавка в магазине по ул. Советской, путем свободного доступа, похитил кошелек с 4 860 000 руб., 4 000 руб. ЦБ РФ у местной жительницы, 1962 г.р. Раскрыто ОУР, сообщает uvd.mogilev.by.

РАНЕЙ СУДЗІМАГА НАЧАЛЬНІКА ЧЭРЫКАЎСКАЙ ПМК-280 АДПРАВІЛІ ЗА КРАТЫ

Суд Чэрыкаўскага раёна вынес прысуд у адносінах да былога начальніа КДБУП "Чэрыкаўскае ПМК-280" Мікалая М., які шляхам загадзя незаконных указанняў арганізаваў збор і перадачу яму грашовых сродкаў з прэміяльных выплат і матэрыяльнай дапамогі працаўнікоў прадпрыемства.

Як паведаміў у сваім артыкуле на інтэрнэт-сайце раённай газеты "Веснік Чэрыкаўшчыны" пракурор Чэрыкаўскага раёна А. Маісееў, суд Чэрыкаўскага раёна прызнаў былога начальніка ПМК-280 вінаватым у завалоданні маёмасцю, здзейсненай пасадавай асобай з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў, паўторна і ў замаху на авалоданне маёмасцю, здзейсненае пасадавай асобай з выкарыстаннем службовых паўнамоцтваў, паўторна і прыгаварыў Мікалая М. да трох гадоў шасці месяцаў пазбаўлення волі з пазбаўленнем права займаць пасады, звязаныя з выкананнем арганізацыйна-распарадчых і

(Заканчэнне на стар. 7)



РАНЕЙ СУДЗІМАГА НАЧАЛЬНІКА ЧЭРЫКАЎСКАЙ ПМК-280 АДПРАВІЛІ ЗА КРАТЫ

(Заканч. Пачатак на стар. 6)

адміністрацыйна-гаспадарчых абавязкаў тэрмінам на пяць год с адбываннем пакарання ў выпраўленчай калоніі ў умовах узмоцненага рэжыма.

Былы начальнік Чэрыкаўскай ПМК-280 спасылаючыся на тое, што яго заработная плата ніжэйшая, чым заработная плата іншых працаўнікоў, у перыяд з верасня па 31 кастрычніка 2014 г. даў указанне падрыхтаваць загад аб выплаце прэмій працаўнікам прадпрыемства, у які ўнёс пункт аб выплаце матэпыяльнай дапамогі двум супрацоўнікам у памеры службовага аклада, пасля чаго ажыццявіць збор і перадаць яму частку атрыманых грашовых сродкаў у памеры 6 800 000 рублёў. Пасля гэтага Мікалай М. паўторна ў перыяд часу з 31 кастрычніка па 27 лістапада даў указанне падрыхтаваць аналагічныя загады, у якія ўнесці пункты аб выплаце матэрыяльнай дапамогі двум супрацоўнікам, прэміяльных выплат у памеры 100% тром супрацоўнікам, пасля чаго ажыццявіць збор і перадаць яму частку атрыманых грашовых сродкаў. 27 лістапада Мікалаю М. былі перададзеныя грашовыя сродкі ў памеры 10 750 000 рублёў, аднак распарадзіцца імі былы начальнік Чэрыкаўскага ПМК-280 не змог, бо быў затрыманы супрацоўнікамі УКДБ па Магілёўскай вобласці.

Здаецца, справядлівасць перамагла, аднак многіх жыхароў Чэрыкаўскага раёна хвалюе іншае пытанне – як магло здарыцца, што Мікалай М. наогул здолеў аказацца на пасадзе начальніка Чэрыкаўскай ПМК-280. У 2011 годзе гэты грамадзянін ужо быў судзімы годзе па ч.1 артыкула 210, ч.2 арт. 210 Крымінальнага кадэкса РБ “Крадзёж шляхам злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі”, і усё кіраўніцтва Чэрыкаўскага раёна і адпаведных службаў Магілёўскай вобласці пра гэта выдатна ведалі. Тым мне менш, праігнараваўшы беларускае заканадаўства і неаднаразовыя распараджэнні кіраўніка краіны Аляксандра Лукашэнкі, раней судзімы за карупцыйнае злачынства грамадзянін Мікалай М. быў прызначаны на адказную пасаду начальніка Чэрыкаўскай ПМК-280.

Нагадаем таксама, што ў 2013 годзе адміністрацыя Чэрыкаўскай ПМК-280 спрабавала прыцягнуць да адказнасці па пазове “Аб абароне дзелавой рэпутацыі” незалежную газету “Вольны горад”. Тады папярэднік Мікалая М. на пасадзе начальніка ПМК-280 А. В. Фралоў абвінаваціў газету ў распаўсюдзе несапраўдных звестак пра тое, што ў арганізацыі існуюць праблемы з своечасовай выплатай заробкаў яе працаўнікам. Дамагчыся станоўчага для сябе рашэння суда тады ў рэшце-рэшт адміністрацыя Чэрыкаўскай ПМК-280 так і не здолела.

Дарэчы, з 2005 г. да канца кастрычніка 2013 г. Чэрыкаўскі раён восем з паловай гадоў узначальваў Мікалай Кадаценка, які зараз працуе старшынёй Бялыніцкага райвыканкама.

Барыс Вырвіч

ГЕННАДИЙ ФЕДЫНИЧ: ПОЧЕМУ ВЛАСТЬ ПРИЗЫВАЕТ ЗАТЯНУТЬ ПОЯСА, А САМА КАК ЖИРОВАЛА, ТАК И ЖИРУЕТ?

(Продолж. Начало на стр. 3)

- После обращения в госструктуры прошло полмесяца. Есть ли информации о погашении задолженности?

- К сожалению, я последней информацией не владею. Очевидно, что задолженность по зарплате растет. Это объективный процесс: откуда можно взять деньги на зарплату, если ты не продал свои товары или услуги? Ведь нет даже достоверной информации о том, сколько оборотных средств сегодня заморожено на складах. Отдали бы зимой колхозам в лизинг свои МТЗ, отдали бы МАЗы – весь все площадки завалены техникой. А люди продолжают работать на склад.

Лукашенко приказывает послам продавать технику. Продажами не послы должны заниматься, а менеджеры, собаку съевшие на этом. Нет таких спецов!

- Как независимые профсоюзы отреагировали на требования профсоюза РЭП?

- Согласились с нашими предложениями, но Совет БКДП не поддержал их. Над каждым предложением нужно работать. Мы распространяем свои требования среди людей; в почтовых ящиках валяются рекламки, а наши листовки с требованиями расходятся.

А ведь съезд выработал только проект требований. Из Бобруйска звонят: а почему вы не написали про другие проблемы? Мы разработали проект – присоединяйтесь! Все вместе мы сможем потребовать от власти. Но словами власть не заставишь шевелиться; если мы подставляем свое плечо, то должны и все подставить – дело-то общее!

Лукашенко на совещании о текущей ситуации на рынке труда и социальной защите населения потребовал от правительства сделать все возможное и невозможное для сохранения квалифицированных кадров. Как сделать невозможное? Сделать можно только возможное. Взять кредит у

(Окончание на стр. 8)

Берегитесь женщин

11 мая Белыничским районным отделом Следственного комитета возбуждено уголовное дело по ст. 147 ч. 1 УК (Умышленное причинение тяжких телесных повреждений) в отношении неработающей жительницы г.п. Белыничи, 1982 г.р., которая 10 мая в своем доме по ул. Крестьянской в г.п. Белыничи, в ссоре, нанесла удары ножом в живот проживающему совместно мужу, 1980 г.р., причинив проникающее ранение. Раскрыто ОДС. Задержан в порядке ст. 108 УПК РБ, сообщает uvd.mogilev.by.

ГЕННАДИЙ ФЕДЫНИЧ: ПОЧЕМУ ВЛАСТЬ ПРИЗЫВАЕТ ЗАТЯНУТЬ ПОЯСА, А САМА КАК ЖИРОВАЛА, ТАК И ЖИРУЕТ?

(Оконч. Начало на стр. 3, 7)

Евросоюза невозможно, потому что он не даст на проедание кредит.

Безусловно, в стране не хватает денег. Но власть и пальцем не пошевелила, чтобы заработать эти деньги. Возможно, на бумаге и есть денежные планы. Но не чиновники должны между собой разговаривать, власть должна говорить с обществом, с народом, вместе с ним искать выход из тупика. Не пойдет режим на разговор с обществом – страну ждет судьба деревообработки.

- Ультиматум РЭПа истекает через полмесяца. Как намерены действовать дальше?

- Мы свяжемся с предприятиями, которые имеют задолженность по зарплате. Если людям нравится жить без зарплаты – мы навязываться не будем. Но мы должны услышать людей и указать им выход. Люди должны понять: если не будем бороться сами за свои рабочие места, за свою зарплату, за условия работы – ничего не изменится. Это мы уже проходили…

- Создание широкого общественного движения по-прежнему является главной целью?

- Безусловно. И государство должно быть заинтересовано, чтобы по стране не пошло движение, которое поставит страну на уши. Я против такого движения. Мы должны консолидировать оставшиеся в Беларуси силы, но при одном условии: государство должно слышать нас, предоставлять СМИ. Независимость страны тоже стоит под большим вопросом, и об этом людям следует говорить честно. Завтра в твою квартиру может прийти сосед и скажет, что часть квартиры принадлежит ему, потому что он сильнее тебя.

Государство должно говорить с народом. Но не так, как после 9 мая, когда одни только хаяли, другие только хвалили. День Победы стране нужен, нужно сделать так, чтобы следующие поколения помнили про подвиг белорусов. Но нужно ли тратить столько средств на парады? Зачем составлять списки людей, которых зовут на парад? Любой праздник может идти только от сердца.

С «Дажынкамі», с парадами пора заканчивать – у страны нет денег! И народ поймет. Но мы сэкономим бешеные деньги, которые вложим в создание новых рабочих мест.

Если ничего не делать, проблемы страны начнутся с каждой отдельно взятой семьи. Как только закончатся деньги на еду, начнутся ссоры, которые выплеснутся на членов семьи, затем – на рабочие места, а в конечном итоге – на улицу. Не хочется хаоса. Но если очень тяжело, нужно признавать: белорусская модель приплыла. Но режим не признает своих ошибок.

- И не собирается признавать. 14 мая на совещании о текущей ситуации на рынке труда и социальной защите населения Лукашенко убеждали, что ситуация на рынке труда контролируемая…

- Нет никаких цифр о количестве белорусов, вернувшихся с заработков из России. В России работали порядка 400 тысяч человек, в основном, строители. Так почему стоят недостроенные здания на проспекте Дзержинского в Минске, на Лебяжем?..

Власть должна разработать программу занятости. МАЗ не должен выпускать 23 тысячи автомобилей, пусть делают 7-8 тысяч – сколько сможем продать. Но остальным рабочим МАЗа, которых сократят, нужно предложить альтернативную работу, куда они смогут трудоустроиться после месячных или трехмесячных курсов переобучения. При этом государство должно выплачивать людям во время обучения не менее 50% зарплаты, которую человек получал на последнем месте работы (в европейских странах выплачивают 70-80%).

Это очень болезненный процесс, но проблема сама не рассосется, как считают многие рабочие. Проблему нужно решать сегодня – завтра может быть поздно. Но ни министерство труда, ни министерство экономики, ни вертикаль не занимаются этим. «Оптимизация» набирает обороты на маленьких и больших предприятиях. Сегодня из близлежащих городов и районов люди ринулись в Минск, чтобы подзаработать. В маленьких городах нет работы вообще. Неужели власть ослепла? Или просто вертикаль боится сказать Лукашенко о реальной ситуации?



Возможно, после такого откровения полетят головы. Но без откровенности мы не только будем топтаться на месте, но и семимильными шагами двинемся назад.

В Белыничском районе трактор сгорел прямо на поле

Недалеко от деревни Гордово Белыничского района днем 11 мая во время работы на поле сгорел трактор, сообщили в пресс-службе Министерства по чрезвычайным ситуациям Беларуси.

До приезда подразделений МЧС тракторист пытался потушить горящую машину самостоятельно, однако безуспешно. К моменту прибытия пожарных трактор горел открытым огнем.

В результате пожара практически полностью выгорели кабина, двигатель, повреждены колеса. Тракторист не пострадал.

Спасатели предполагают, что причиной пожара стало короткое замыкание электропроводки.

Анекдот дня

Если супруга вам изменила, вам поможет развеяться легкий шопинг. Купите топор, полиэтиленовый мешок, ведро кислоты и негашеную известь.

Если у вас в отношениях с девушкой всё в полном порядке, то, возможно, это уже не ваша девушка.

ПАХОДНЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА

Грамадска-палітычная газета. Выдаецца на беларускай і рускай мовах, распаўсюджваецца бясплатна. Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем выдаўца газеты.

Адрас рэдакцыі: 213173, Бялыніцкі раён, аг-к Вялікая Машчаніца, вул. Савецкая, д. 4. Тэл. 8 (02232) 37-365. E-mail: boris196608@bk.ru. Выдавец Вырвіч Барыс Іванавіч. Наклад 299 асобнікаў. Надрукавана на ўласным абсталяванні. Падпісана ў друк 20.05. 2015 г. у 15-00.